Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

# РОДНАЯ МОВА
(дыдактычная гульня)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Узрост: выхаванцы 4-5, 5-6 гадоў.

Задачы: авалодваць багаццем роднай мовы; развіваць моўныя здольнасці, атрымліваць першапачатковыя навыкі размовы на беларускай мове; фарміраваць у дзяцей устойлівую цікавасць і станоўчыя адносіны да беларускай мовы, жаданне авалодаць беларускай мовай праз знаёмства з беларускім фальклорам – забаўлянкамі, казкамі, песенькамі, лічылкамі.

Дыдактычная гульня “Назва вырабу”

Узрост: выхаванцы 5-6 гадоў.

Задачы: замацаваць веды дзяцей аб назвах вырабаў беларускіх ганчароў.

Гульнявая задача – па сілуэту вызначыць, як называецца рэч і дзе яна ўжываецца.

Хто правільна называе выраб, той атрымлівае фішку. Пераможцам з’яўляецца той, хто больш за ўсіх атрымае фішак.

Дыдактычная гульня “Перакладзі з беларускай мовы”

Узрост: выхаванцы 5-6 гадоў.

Задачы: замацаваць уменне перакладаць словы з беларускай мовы на рускую.

Гульнявая задача: дзеці становяцца ў кола, выхавальнік знаходзіцца ў цэнтры. Ён кідае дзецям мяч і называе беларускае слова. Дзіця, якое злавіла мяч, павінна перакласці слова на рускую мову (лялька, цукерка, цукар, дзеці, вожык, сонейка, сукенка, хлопчык, дыван, прас, бульба.)

Дыдактычная гульня “Беларусь і нашы суседзі”

Узрост: выхаванцы 5-6 гадоў.

Задачы: удакладняць і замацоўваць уяўленні дзяцей аб гарадах Беларусі і аб суседніх краінах; практыкаваць ва ўжыванні патрэбных слоў; замацоўваць правільнае вымаўленне ўсіх гукаў роднай мовы, фарміраваць выразную дыкцыю, развіваць сэнсаматорыку, уменне арыентавацца на плоскасці; выхоўваць пачуццё павагі да іншых краін і пачуццё гонару за сваю дзяржаву.

Дзецям прапануецца поле для гульні, на якім абазначаны абласныя гарады Беларусі, а таксама суседнія краіны: Літва, Латвія, Расія, Польшча, Украіна. Дзеці складаюць назвы гарадоў і краін згодна з узорам поля (адным словам ці літарамі). Пераможцам лічыцца той, хто першы без памылак складзе ўсе назвы і правільна вымавіць іх па-беларуску.